Цана асобнага нумару 20 грошаў.

ВОДКЛІК

АДНАДНЁЎКА

Вільня, Чацьвер 24-га сакавіка 1927 г.

Дьзве ідэалёгіі.

Пасьля таго, як галоўныя павадыры сялянска-работніцкага руху ў Заходняй Беларусі апынуліся за вастрожнымі кратамі, тыя элемэнты, якія шмат прычыніліся да гэтага, прызналі, што настаў іх чарод, каб з'арганізаваныя ў ліквідаванай цяпер польскім урадам „Грамадзе“ масы прыбраць у свае рукі. З гэтай мэтай маральныя вінавайцы арыштаў грамадаўскіх паслоў крывадушна „баранілі“ іх з соймавае трыбуны, наперад ведаючы, што „той зашчыт як кадзідла памог“,—а цепер сярод сялянства вядуць агітацыю, тлумачучы, быццам між імі і „Грамадой“ — „няма ніякае розьніцы“... Так прынамся інфармуюць нас сяляне з Наваградчыны — выбарнага вокругу пасла Рагулі.

Народ, праўда, сам сваім адумам адчувае вельмі добра, якая глыбокая розьніца істнуе паміж грамадаўскай ідэалёгіяй— з аднаго боку, ды сельсаюзьніцка-хадэцкай—з другога. І мы лічылі б зусім лішнім навет перасьцерагаць менш сьвядомых вяскоўцаў перад ваўкамі ў авечай скуры, калі-б справа йшла толькі аб тыя ці іншыя штучкі ворагаў сялянска-работніцкае ідэалёгіі. Але тутака мы маем дзела *з вельмі паважным зьявішчам у беларускім грамадзкім жыцьці* [illegible]чам крыху супыніцца.

Бо-ж справа ў тым, што ўсё беларускае грамадзянства цяпер выразна дзеліцца на *два ўзаемна варожыя сабе абозы*. З аднаго боку мгем сьвядомыя нацыянальна і сацыяльна сялянска-работніцкія масы і болей ці меней блізкія ей па сваей ідэалёгіі інтэлігенцкія элемэнты, з другога — аб'яднаны фронт сельсаюзьнікаў, хадэкаў, ды рознага гатунку „полёнофілаў“ з яўна буржуазнай ідэалёгіяй. Паміж гэтымі двума абозамі ляжыць *глыбокая, непраступная прорва перадусім ідэйнага характару*: пад той час, як сялянска-работніцкі рух, найбольш радыкальны сацыяльна, ідзе поплеч з такім-жа рухам сярод усіх іншых народаў Польшчы, не выключаючы, ведама, і аб'яднаных *польскіх сялян ды работнікаў*, уся беларуская „правіца“ цягнецца ў хвасьце *польскага фашызму*, толькі паадзінокія групкі гэнае „правіцы“ паразнаму зьвязаны з польскімі фашыстамі і знаходзяцца ў рознай залежнасьці ад іх. Гэтак беларускія хадэкі, якія прадстаўляюць адбіцьцё літоўскага фашызму, пасьля ўгоды між польскім і літоўскім фашызмам увайшлі ў *саюзныя* адносіны з польскімі фашыстамі і найменш ад іх залежныя. Бліжэй да польскага фашызму група Ярэміча, Рагулі і Більдзюкевіча („Сялянскі Саюз“), якія, толькі йдучы ў хвасьце польскага фашызму, могуць спадзявацца здабыць пасольскія мандаты ў новым сойме. Сельсаюзьнікі стараюцца дзеля віду іграць ролю *„оппозиции Его Величества“*, якую некалі ігралі ў Расеі „кадэты“ ў адносінах да царскае ўлады. Рэшта-ж „полёнофілаў“, незалежна ад таго, ці яны сіляцца ўваскрасіць даўно збанкрутаваўшую і памершую партыю беларускіх эсэраў, ці фабрыкуюць нейкія самачынныя „нацыянальныя рады“, ці выступаюць адкрыта, як польскія ўрадоўцы, — усе гэтыя катэгорыі ўжо ня ўкрываюць свайго запраўднага *службовага* становішча ў адносінах да польскага фашызму. Але ўсіх іх злучае адна супольная палітычная лінія: *барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць, з беларускім сялянска-работніцкім рухам*, які ні ў якім выпадку і ні на якіх варунках ня можа пайсьці дый ня пойдзе на ўгоду з польскім, ці літоўскім, або йшчэ якім іншым фашызмам.

У гістарычны дзень.

(1918 25.III 1927)

Акт 25 сакавіка 1918 году, якім Рада Бел. Нар. Рэспублікі абвясьціла ў Менску незалежнасьць Беларусі, адыграў вялікую ролю ў беларускім адраджэнскім руху. Акт гэты папхнуў беларускі рух у кірунку **дзяржаўнага будаўніцтва**, вызначыўшы гэтак шлях, па якім і пайшлі беларускія сяляне і работнікі ў мамэнт **здабыцьця ўлады** на сваей зямлі. Абвешчаныя дзевяць гадоў назад усяму сьвету **словы** пяратвораны ў **дзела** мазалістымі рукамі працоўных масаў — на землях Усходняе Беларусі.

Ведама, зьдзейсьненьне таго, што абвяшчаў акт 25 сакавіка 1918 году, адбылося ня ў тэй форме, і ня ў тых межах, як праектавалі творцы **незалежніцкае ідэі**. Беларусь апынулася паміж дзьвюма варожымі сабе ўзаемна сіламі: камуністычным Усходам і буржуазным Заходам, і вынік барацьбы між гэтымі сіламі вырашыў лёс і Беларусі. Праз жывое цела Беларусі прайшла польска-радавая гранічная мяжа, і пад той час, як Усходняя Беларусь увайшла ў склад Саюзу Сацыялістычных Радавых Рэспублік, як самастойная адзінка, — Заходняя апынулася ў межах Польскае Рэспублікі. А ў сувязі з гэтым на абедзьвюх паловах Беларускае Зямлі запанаваў зусім розны дзяржаўны лад, абаперты на дыктатуры пралетарыяту на Усходзе і дыктатуры буржуазіі — на Заходзе.

Глыбокая прорва выкапана паміж абедзьвюма часьцінамі нашае Бацькаўшчыны рукамі тых, хто падпісаваў Рыжскі Трактат аб падзеле Беларусі. Гэтак той пункт акту 25 сакавіка 1918 году, які кажа аб **аб'яднаньні пад супольнай дзяржаўнай страхой усіх зямель, дзе пераважае беларускае насяленьне**, — аказаўся йшчэ больш далёкім ад свайго зьдзейсьненьня, чым лятуценьні аб поўнай дзяржаўнай незалежнасьці Беларусі.

Аднак, іменна гэты пункт так крэпка ўеўся ў сэрцы беларускага народу, што—незалежна ад формы нашага дзяржаўнага будаўніцтва — імкненьне да **аб'яднаньня Усходняе і Заходняе Беларусі** ў роўнай меры выяўляецца наабапал праведзенае ў Рызе штучнае граніцы. Бо-ж тут і там чутна тая-ж беларуская мова; бо тут і там аднолькава б'юцца сэрцы беларускіх сялян і работнікаў; бо і тут і там думка народу з роўнай сілай імкнецца да тварэньня **адзінае беларускае нацыянальнае культуры**, роднай — сваей — і для нашага Усходу, і дя нашага Заходу.

Гэтая супольная праца, гэтыя супольныя культурныя цэннасьці, твораныя беларускім народам, так крэпка зьвязваюць усходніх і заходніх беларусаў у **адну сям'ю**, што ніякія палітычныя граніцы ня здолеюць разарваць еднасьці іх. Панад гранічнымі капцамі лунае **адна супольная думка**, і ніякая **фізычная** сіла забіць яе ня можа!

І ў гэтым — непарушная апора дзеля нашае веры ў зьдзейсьненьне нашых імкненьняў да злучэньня абедзьвюх частак нашага народу. У гэтым — выпаўненьне вечна жывога, незалежнага ад зьменных палітычных абставінаў і орыентацыяў лёзунгу, які быў абвешчаны дзевяць гадоў назад.

Вось, у гэтым прынцыповым разыходжаньні і крыецца прычына немагчымасьці якіх колечы кампрамісаў паміж двума палітычнымі абозамі, на якія падзелена сяньня беларускае грамадзянства. *Барацьба між гэтымі абозамі ня можа спыніцца ні на адзін мамэнт.* Але мы таксама ні на адзін мамэнт не сумляваемся, што ў гэтай барацьбе *перамога будзе на старане таго, за кім пойдуць беларускія працоўныя масы*. А яны ўжо падалі свой голас ды свой шлях да перамогі і вызваленьня — *выбралі*!

Абвяшчэньне Грамады нелегальнай партыяй.

Такі-ж лёс спаткаў і Незалежную Партыю Хлопскую.

Міністар унутраных спраў прызнаў Беларускую Сялянска-Работніцкую Граматы і Незалежную Партыю Хлопскую варожымі да польскае дзяржаўнасьці і істнуючага ў ей ладу і абвясьціў абедзьве арганізацыі забароненымі і нелегальнымі.

На гэтай падставе ваяводамі ваяводзтваў, якія ўваходзяць у склад Заходняе Беларусі, выданы адозвы да насяленьня гэтых ваяводзтваў — з заклікам да выхаду з Грамады і выдачы ўладам усіх актаў і друкаў партыйных, пячатак і г. д. Ваяводы перасьцерагаюць, што адгэтуль усе, хто будзе належаць далей да Грамады ці прымаць учасьце ў дзеяльнасьці яе, як забароненай, будзе цягнены да судова-карнае адказнасьці з усей суровасьцяй закона.

Такія-ж адозвы апублікаваны і ў справе Нез. Парт. Хлопскай.

МАТЫВЫ

У асобным камунікаце, апублікаваным урадам у польскай прэсе, падаюцца гэткія падставы загаду міністра ўнутраных спраў аб прызнаньні Грамады і НПХ нелегальнымі арганізацыямі:

a) Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада, працуючы выключна сярод беларускага насяленьня, якое жыве на тэрыторыі паўночна-ўсходніх ваяводзтваў (Віленскага, Наваградзкага, часьці Палескага і Беластоцкага), а таксама Нележная Партыя Хлопская, знаходзіліся пад уплывам і дырэктывамі чужацкіх чыньнікаў, цесна супрацоўнічаючы з камуністычнай партыьй, у адносінах да якое ігралі ролю яўных пляцовак, якія давалі камуністычным чыньнікам адкрыта вясьці рэвалюцыйную работу, засланяючыся легальнасьцяй гэтых дзьвюх партыяў.

b) Бел. Сял.-Раб. Грамада, прыкрываючыся нібы-то падтрымліваньнем нацыянальных імкненьняў беларускага народу, пад кіраўніцтвам чужацкіх чыньнікаў вяла на дзеле працу дзеля падгатаваньня і выкліканьня аружных выступленьняў з мэтай адарваньня ад Польскае Рэспублікі паўночна-ўсходніх зямель.

c) У адносінах да паасобных асоб, якія выступалі проці рэвалюцыйнае работы Грамады, — арганізацыя гэная тасавала сыстэму тэрору ў пастаці злачынных падпалаў і забойчых замахаў.

d) Сябры грамады масава займаліся шпіёнствам на карысьць суседняе дзяржавы, стараючыся адначасна вясьці рэвалюцыйную агітацыю сярод войска, дапамагаючы рэкрутам ухіляцца ад выпаўненьня ваеннае службы і ўкрываючы дэзэртэраў.

e) Н. П. Х., цесна супрацоўнічаючы з Грамадой і знаходзячыся пад дырэктывамі камуністычнае партыі, вяла агітацыю ў кірунку звапеньня істнуючага ладу і выкліканьня сацыяльнае рэвалюцыі — на ўзор расейскае.

f) Абедзьве названыя партыі, апрача таго, вялі выдатную акцыю, скіраваную проці абязываючых у Польшчы законаў і загадаў уладаў, агітуючы, каб не плацілі падаткаў і грамадзкіх павіннасьцяў, каб выступалі проці праводжаньня адпаведнымі ўладамі вызначанае праграмы зямельных паляпшэньняў у пастаці мэліарацыі, комасацыі і касаваньня сэрвітутаў, перашкаджаючы выпаўненьню заданьняў, зьвязаных з зямельнай рэформай, склікаючы нелегальныя сходы і пабуджаючы мала сьвядомыя элемэнты да апору ўладам.

Урэшце ўся дзеяльнасьць абедзьвюх арганізацыяў—паводле слоў камунікату—праводзіла сьвядома і праграмова раскладовыя мамэнты ў грамадзянства, паглыбляючы нацыянальныя, рэлігійныя і сацыяльныя супярэчнасьці сярод насяленьня.

Як адбываецца ліквідацыя.

У Вільні зроблены вобыск і апячатана памяшчэньне Цэнтральнага Сэкрэтарыяту Грамады (Вялікая вул. 30, кв. 9). Тое-ж зроблена і з сэкрэтарыятам НПХ.

Адначасна паліцыя пазабірала ўсе матэрыялы і рэчы ў павятовых камітэтах Грамады, а памяшчэньні паапячатавала.

Арыштаў пры гэтым ня было.

Сэнсацыйныя весткі.

Некалькі дзён назад у літоўскіх газэтах падняўся алярм — з прычыны гуртаваньня польскіх войск на літоўскай граніцы. Уся польская прэса назвала гэтую вестку—дзікай хлусьнёй. Але вось у нямецкай прэсе зьявіліся з фінляндзкіх, радавых і эстонскіх крыніцаў дакладныя апісаньні таго, што быццам робіцца ў Літве і на яе граніцы — на карысьць захвату Літвы Польшчай.

Быццам Англія, як і Італія ў Альбаніі, дазволіла Польшчы ў Жэнэве расправу з Літвой, загарантаваўшы Польшчы яе заходні тыл (з боку Нямеччны) ў часе паходу... Пасьля гэтага зараз-жа прыхільнікамі „злучэньня з Польшчай“ была арганізавана ваенная змова, у якую ўцягнены падкуплены 5 полк ковенскіх стральцоў, які меў зрабіць новы пераварот — на карысьць Польшчы... Адначасна на літоўскай граніцы польскі ўрад меў сабраць „ударны атрад“, які — ў разе хоць часовага пасьпеху перавароту — меў шпаркім маршам заняць Коўну... Але змова была ў час выкрыта. Аднак-жа вестка аб тым, што польскія войскі стаяць на граніцы, выклікае дагэтуль вялікую трывогу ў Коўне. Літоўскі ўрад быццам ўсё радзіцца, што рабіць, бо быццам польскі ўрад паслаў Літве ўльтыматум—з цэлым радам дамаганьняў. У выпадку адмовы польскія войскі займуць Літву.

Быццам усё гэта мела адбыцца якраз у дзень імянінаў марш. Пілсудскага. Але дагэтуль нешта спаўненьня гэтых пагрозаў няма!

Аднак-жа, што нешта было ці ёсьць, аб гэтым ясна кажа тэлеграма ковенскага карэспандэнта рыжскай газэты „Сегодня“, які піша:

„Афіцыяльна літоўскі ўрад паведамляе, што чуткі аб перагрупаваньні польскіх войскаў на граніцы пацьвярджаюцца; дык літоўскі генеральны штаб прыступіў да канцэнтрацыі (сьцягіваньня) літоўскіх войскаў на польскай граніцы“.

Галадоўка палітычн. вязьняў у Вронках.

Толькі цяпер з вастрогу ў Вронках дайшла вестка аб тым, што 2-га сакавіка тамака палітычныя вязьні распачалі галадоўку, якая 12-га сакавіка яшчэ трывала.

Як ведама, у Вронкі перавезены з Лукішскае турмы ў Вільні 10 палітычных вязьняў—беларусаў, у тым ліку і пяцера паслоў. Яны разьмешчаны ў Вронках у „адзіночках“ у асобным корпусе (жаноцкім). Ня гледзячы на гэта, калі да іх дайшла вестка аб галадоўцы палітычных, і яны ўсе далучыліся да яе, дадаючы да агульных дамаганьняў і сваё спэцыяльнае: каб іх перавялі ў агульны будынак.

Галадаючыя дамагаюцца: адчыньня на дзень камэраў і дапушчэньня свабодных зносінаў паміж вязьнямі, (у Вронках агульных камэр няма, і ўсе сідзяць у „адзіночках“); дапушчэньня ўсіх газэт і кніжак, якія выходзяць легальна; права завясьці супольную касу палітычных і падзелу ахвяр [illegible] волі паміж усімі палітычнымі вязьнямі; паляпшэньня ежы; паляпшэньня лекарскае помачы і г. д.

Ад 12-га сакавіка ніякіх новых вестак аб галадоўцы не паступала, і вынікі яе — няведамы.

Пасьля лодзкае забастоўкі.

Усепольская забастоўка работнікаў валакністае прамысловасьці скончылася раптоўна, пратрываўшы каля тыдня. Цяпер можна разглядзецца, як сьлед, у прычынах і ходзе яе.

Пашырэньне забастоўкі.

Забастовачны рух, распачаты ў адзяй галіне прамысловасьці, — праўда, найбольш шматлюднай у Польшчы, — пачаў пашырацца і на іншыя.— Арганізацыі мэталістаў зачалі, што падтрымваюць сваіх таварышоў-ткачоў ды прадзільшчыкаў, і 17 сакавіка спочылі свае абяцаньне. У суботу 19 сакавіка мела распачацца ў Лодзі ўжо—агульная забастоўка работнікаў усіх галінаў працы і сяды, не выключаючы працаўнікоў установаў агульнага ўжытку і першай патрэбы, — як мястовых вадаправодаў, электрыкі і інш. Адначасна з выбухам забастоўкі, як пісаў „Роботнік“, распачаўся рух сярод чыгуншчыкаў.

Эканамічна работнікі стаўлялі сабе мэтай барацьбы — здабычу рэальнае платы за працу, спыненьня таго паўгаладнага, а часта і зусім галоднага існаваньня, якое вядзе ў Польшчы амаль не ўся армія яе пралетарыяту. Адначасна, як кажа „Роботнік“, магутны ўздым работніцкага руху меў заманіфэставаць пратэст працоўных места проці замаху на іх палітычныя правы—на існуючы Выбарны Закон—з боку рэакцыі ў Сойме.

Магутным рухам работнікаў былі захопленыя ня толькі іх „павадыры“ з ППС: як стрымалі „свае“ работнікаў і „нацыяналісты“—„эн-пэ-эры“, а навет і хадэкі.

Сьпярша мітынгі забастоўшчыкаў адбываліся амаль-што бяз усякіх перашкодаў з боку паліцыі. Пасьля, як сьведчыць „Роботнік“, пачаліся—забароны і разгоны...

Правакацыйнае становішча прамыслоўцаў.

Урад пастанавіў умяшацца ў забастоўку і запрапанаваў свае пасрэдніцтва. 18 сакавіка ў Варшаве адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў работнікаў і прамыслоўцаў у міністра працы. Прамыслоўцы рашуча адмовіліся ісьці на ўступкі і наадварот, дамагаліся зьмяншэньня платы і пазбаўленьня работнікаў цэлага раду прызнаных ім законам правоў.

Адначасна з гэтай акцыяй валаконных прамыслоўцаў—у Лодзі аб'ядналіся прамыслоўцы — уласьнікі гутаў і кафлявых, сабраўшыся на зьезд свае Рады, зрабілі прост правакацыйную пастанову. Прамыслоўцы-гарнякі пастанавілі ад першага красавіка скасаваць усе ўмовы з работнікамі і запрапанаваць новыя—на гэтых новых варунках: 1) плата абніжаецца на 4—7 прац.; 2) касуюцца работніцкія дэлегацыі; 3) час працы павялічваецца з 8 да 10 гадз. у дзень 4) абмяжоўваюцца ці фактычна касуюцца адпускі для работнікаў; 5) зьмяншаецца вылача работнікам натурай вугальля і інш. тавараў горных. На гэтыя дамаганьні прамыслоўцаў прадстаўнікі работнікаў адказалі, што гэта—яўная правакацыя, што прапанаваць такія варункі — чысты цынізм, што зьмяніць правы, загарантаваныя работнікам існуючымі законамі, прамыслоўцы ня маюць права, а сярод работнікаў — няма дурняў. З свайго боку работнікі выставілі трэбаваньне, каб, пакінуўшы ўсё іншае, як ёсьць, плата была павялічана агулам на 15 прац.

Перагаворы аб арбітражу.

18 сакавіка, пасьля няўдачы місіі мін. працы, урад на паседжаньні Рады Міністраў пастанавіў запрапанаваць абодвум лагерам свой „арбітраж“, ці інакш сябе — у судзьдзі паміж работнікамі і прамыслоўцамі. Першым чынам павінна была быць разгледжана справа канфлікту ў прадзільна-ткацкай прамысловасьці.

Увечары 18-ж сакавіка ў Лодзі адбылося паседжаньне прадстаўнікоў Работніцкіх Прафес. Саюзаў у Лодзі, на якім пастанаўленьне было адмовіцца ад суду ўраду ў канфлікце...

Адначасна, паведамляе „Роботнік“, на паседжаньні прэзыдыўму ППС разам з дэлегатамі Ц. К. Праф. Саюзаў быў сьцьверджаны факт узрастаючага наступаньня капіталу проці сацыяльных здабычаў работніцкай клясы, ды немагчымасьці для жыцьця заработнае платы і безнадзейнага палажэньня масаў беззработных; было сьцьверджана, што ўрад, зьвязаны палітыкай кампраміcу з клясамі валадаючымі, не выяўляе ніякай энэргіі проці наступу капіталу, але, наадварот, усё больш паддаецца яго націску... Дзеля гэтага абедзьве арганізацыі пастанавілі безадкладна прыступіць да падрыхтаваньня салідарнай эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай барацьбы работніцкай клясы—у абароне сваіх правоў і інтарэсаў.

Неспадзяваны паварот.

Такія рашучыя заявы ня сулілі хуткае ліквідацыі забастоўкі. Наадварот, узьнялася пагроза, што агульная забастоўка з Лодзі перакінецца і далей. Але 19 сакавіка — пад уплывам пэпэсаўскіх павадыроў — выбух агульнае забастоўкі быў прыпынены. Адбылося новае паседжаньне Міжсаюзнай Камісіі ў справе прапанаванага ўрадам арбітражу. З 10 саюзаў прымалі ўчасьце ў паседжаньні 9; кожны меў па 2 галасы. Пасьля вельмі „апазіцыйных“ прамоваў п. п. пэпэсаў — проці арбітражу, ды проці п. Бартля, які толькі-што ў сваей заяве абвініў у забастоўцы выключна работнікаў, —адбылося тайнае галасаваньне, якое дало 10 галасоў—за прыняцьце прапазіцыі ўраду, каб яму работнікі даверылі вырашэньне свае споркі з прамыслоўцамі... Камісія далучылася да большасьці і паведаміла лодзкага ваяводу, што работнікі прымаюць арбітраж ураду. Адносна спыненьня забастоўкі Камісія засьцерагла сабе некалькі гадзінаў часу.

Пасьля цэлага раду мітынгаў і нарадаў была прынята аканчальная пастанова. Камісія абвясьціла аб спыненьні забастоўкі...

Рэзалюцыя.

Вось гэтая характэрная пастанова Камісіі:

„Міжсаюзная Камісія, лічучы, што становішча ўраду, як і прамыслоўцаў, утруджае далейшую барацьбу работніцкай клясы і змушае яе да прыняцьця арбітражу,—адказнасьць за гэта цалком ускладае на правакацыйнае і няўступлівае становішча прамыслоўцаў, а таксама і на ўрад, які побач з прамыслоўцамі імкнецца да галоднае платы работнікам у Польшчы.—Дзеля таго Камісія адклікае забастоўку 21 сакавіка“.

Сабраньне дэлегатаў саюзу работнікаў валаконнай прамысловасьці, апрача таго, прыняло ўвечары таго-ж дня рэзалюцыю, якая выражае востры пратэст проці вырашэньня канфлікту шляхам арбітражу. Аднакжа, дзеля таго, што далейшая барацьба — залішне цяжкая, сабраныя прынялі да ведама пастанову Міжсаюзнай Камісіі.

Чаго хацелі пэпэсы?

Разглядаючыся ў ходзе выпадкаў і гучных заявах пэпэсаўскае прэсы, якая мелася „вясьці на барацьбу“ ўвесь пралетарыят Польшчы, ды стаўляючы ўсё гэта з неспадзяваным адбоем П. П. С. і спыненьнем забастоўкі, прыходзіцца зрабіць такі просты і ясны вывад. Пэпэсы, якія ўжо даўно губляюць свае уплывы ў работніцкіх масах, хацелі на голадзе работнікаў „адыграцца“ і абвясьцілі забастоўку, якая была дужа папулярная. Запраўды, палажэньне працоўных дайшло да таго, што яны забаставалі бы на кліч кожнага, хто ўзяўся-бы павясьці іх на барацьбу. Але пэпэсам трэба было не барацьбы: яны хацелі зрабіць палітычную дэманстрацыю і паказаць работніцкі кулак сваім канкурэнтам на кіраўнічае месца ў урадзе марш. Пілсудскага. Зрабіўшы гэта, П.П.С. спыніла работніцкую стыхію, гатовую выйсьці з берагаў. — і зрабіла гэта ў дзень імянін марш. Пілсудскага як „імянінны дар“...

Ці толькі развярушаныя масы, на гэтым супакояцца, — гэта другое пытаньне.

У Сойме.

Эндэцкі праект „процікамуністычнага“ закону.

Яшчэ толькі ў летку прошлага году эндэкі, як ведама, высоўвалі праект легалізацыі камуністычнай партыі, пазываючыся пры гэтым на прыклад усяе Эўропы,—а вось цяпер раптам апрацавалі праект закону аб „барацьбе з камунізмам“, які і падалі ў Сойм. 19 сакавіка канстытуцыйная камісія пачала разгляд гэтага „праекту“.

Праект разглядаецца ў „канстытуцыйнай“ камісіі мо' затым, што ён зьяўляецца яўным нарушэньнем Канстытуцыі, калі не казаць аб яго недарэчнасьці ды папросту невыканальнасьці. Бо-ж, калі і цяпер у Польшчы, а перадусім „на крэсах“ пануе, як сказаў сам мін Мэйштовіч. — „атмосфэта шпеговска“, дык што было-б, калі-б увайшоў у жыцьцё закон, апрацаваны эндэцкімі мазгамі?

Паслухайце. Праект дамагаецца кары, як за „замах на дзяржаўны лад Польшчы“, для ўсіх тых асобаў, якія „маюць зносіны з арганізацыямі ды асобамі, што знаходзяцца заграніцай, — з мэтай падрыхтаваньня камуністычнай рэвалюцыі“... Далей праект трэбуе безадкладнага зачыненьня ўсялякіх арганізацыяў, партыяў і саюзаў, якія „імкнуцца да камуністычнае, рэвалюцыі“... Далей — праект пазбаўляе безадкладна мандатаў усіх выбраных у самаўрады сяброў — ня толькі тых, якія самі ўваходзяць у камуністычныя арганізацыі, але і тых, якія „астаюцца ў адносінах залежнасьці(?) ад гэтых арганізацыяў“... Пры гэтым „пазбаўленьне мандатаў“ выбраных народам самаўрадавых дзеячоў — „за адносіны залежнасьці“ —будзе рабіць навет ня суд, але — „надзорчыя ўлады“ ў самаўрадах, ці — паны старосты і ваяводы...

Але і на гэтым праект эндэцкага „дзяржаўна-творчага“ розуму ня спыніўся. Ён ідзе яшчэ шмат далей. — Ён дае права „выбарнай камісіі“ ўневажняць усе тыя кандыдацкія сьпіскі па выбарам у Сойм, у Сэнат і ў самаўрады, якія ці яўна назавуць сябе камуністычнымі, ці „камунізуючымі“ (паказываючы сувязь іх з камуністычнымі арганізацыямі“), ці — якіх „залежнасьць ад гэтых арганізацыяў будзе сцьверджана тым ці іншым спосабам“.

Праект яўна мае мэтай ратаваць эндэцыю ды родную ей рэакцыю — у часе набліжаючыхся выбараў. Каго можна наагул падцягнуць пад паняцьце „залежных ад камуністычных арганізацыяў“, — аб гэтым ясна кажуць нашы віленскія публіцысты, як пан Обст і іншыя. Калі, напрыклад „камунізуючай“ называе Грамаду кс. Станкевіч, дык пан Обст самога ксяндза лічыць і называе... „бальшавіцкім агентам“, значыць — „залежным ад камуністычных арганізацыяў“ і „ўваходзячым у зносіны з асобамі і арганізацыямі, што знаходзяцца заграніцай,—у мэтах“... і гэтак далей...

Эндэцкі розум і апэтыты, аднак-жа ня сустрэлі прызнаньня навет і ў Сойме. Адзін за адным сябры камісіі грамілі гэты праект. Ядавіта адзначалася, што эндэкі бароняць існуючы ў Польшчы дзяржаўны лад чамусьці толькі ад небясьпекі зьлева, ня кажучы нічога аб арганізацыях фашыстаўскіх ды манархістычных, якія таксама рыхтуюцца да замаху... Казалі аб тым, што ўся „юрыдычная тэрміналёгія“ праекту — папросту — нячувана дурная: як азначыць юрыдычна „імкненьне да камуністычнай рэвалюцыі“, ці „залежнасьць ад камуністычных арганізацыяў“? Пэпэсы давалі прыклады, як на „крэсах“ „інтэлігэнтная“ адміністрацыя камуністамі лічыць усіх пэпэсаў, ня кажучы ўжо аб больш радыкальных работніцкіх і сялянскіх партыях. Навет „работнікі-нацыяналісты“, родныя эндэкам, назвалі „праект“ іх — „дурным“.

Але, ня гледзячы на ўсё гэта, прапазыцыя адкінуць цалком праект, як недарэчны, правалілася. Правалілася навет прапазыцыя хадэкаў, каб выбраць для пераробкі праекту спэцыяльную пад-камісію. Праект большасьцю галасоў прыняты за падставу адпаведнага закону і будзе далей разглядацца ў другім чытаньні.

Цікаўна, што прадстаўнік міністэрства справядлівасьці заявіў, што ўрад ня мае нічога сказаць аб гэтым праекце — ні за яго, ні проці, а толькі міністар просіць Сойм, каб не даручаў выкананьне гэтага закону яму, а — міністру ўнутраных спраў... Калі ўжо навет п. Мэйштовіч адкрыжоўваецца ад эндэцкага праекту, дык відаць — добры...

„Самаўрадавая пяцёрка“ працуе!

Адміністрацыйная камісія ўсьцяж працуе над праектам самаўрадавага закону. Праўда, з камісіі працуе толькі так-званая „пяцёрка“ ці „шасьцёрка“ партыяў, якія паразумеліся ды сьпеліся, ўжо амаль не ў-ва ўсіх спорных пытаньнях, — ведама-ж, коштам нацыянальных меншасьцяў, якія ўсе дружна заявілі рашучы пратэст проці гвалчэньня правоў няпольскага насяленьня ў самаўрадах, ды пакінулі пасьля гэтага ўсялякую працу ў камісіі.

Цікаўна, што пасьля гэтае заявы меншасьцяў выходзіўшых з салі меншасьцёвых дэпутатаў эндэкі разам з пэпэсамі востра лаялі, называючы іх паступаньне — „правакацыяй“ ды „звычайным палітычным шантажам“...

Законапраект аб сабраньнях — гатовы.

Канстытуцыйная камісія Сойму, пасьля здаецца 4-летняй працы, апрацавала нарэшце Закон аб Сабраньнях. Пачатны праект закону апрцаваны яшчэ ў часе слаўных хіена-пястоўскіх „жондаў“ ў 1923 г. — паслом Лютаславскім. Праект тых часоў, праўда, значна папраўлены ў камісіі, але ж ведама, што да прадбачанай у Канстытуцыі „вольнасьці сабраньняў“ яму таксама далёка, як курыцы да сакала. Законапраект кажа і аб пасольскіх справаздаўчых мітынгах, якім таксама ставіць пэўныя путы.

Ці дачакаецца гэты праект свайго ажыцяўленьня, сумляваецца навет яго абаронца ў камісіі пас. Чапінскі. Бо-ж запраўды няведама зусім, сколькі часу дазволіць жыць Сойму ўрад і ці дасьць яму зрабіць штосьці апрача прыняцьця бюджэту... Толькі што аб гэтым рубам паставілі пытаньне старшыні Сойму некаторыя паслы. Той адказаў, што — „ня ведае“...

Барацьба за вызваленьне Кітаю.

Нанкін—ў руках кантонцаў!

Нанкін, вялікае места і вялізарнай важнасьці стратэгічны пункт на шляху паўночных арміяў, што ідуць на „вызваленьне“ Шанхаю,—ўзяты з бою кантонскай арміяй

Вестка аб гэтым з Шанхаю пацьвярджаецца тэлеграмай з ангілйскіх крыніцаў.

У дадатак—тры генаралы з арміі Чанг Тунг-Чанга перайшлі на бок кантонцаў.

У выніку перамогі, кантонская армія шпарка пасоўваецца ўперад. Заняты цэлы рад местаў. Генарал Чанг-Тунг-Чанг выехаў у Пэкін на нараду з Чанг-Тсо Лінам.

Гэткім чынам **Шанхай зусім адрэзаны на сушы ад паўночнай арміі,** дык павінен будзе сам сабой—бяз бою—аддацца ў рукі кантонцаў. У месьце ўжо ідзе яўная акцыя ў гэтым напрамку. Работнікі абвясьцілі—агульную забастоўку, якая спыніцца, як кажа адозва камітэту, толькі з уваходам у места кантонскіх уладаў.

Каб ратаваць ад небясьпекі жыхараў места пры баёх, у Шанхаі стварыўся цывільны ўрад, які мае ўзяць уладу ў свае рукі—пры прыбліжэньні кантонцаў. Чужаземныя ўлады пастанавілі бараніць толькі свае канцэсіі, але ня ўмешывацца ў баі аб кітайскі Шанхай.

У 30 кілямэтрах ад Шанхаю ідзе рашучы бой які вырашыць лёс места. Але ўжо між камандзірам Шанхайскіх войскаў і галоўнай кватэрай кантонскай арміі ідуць перагаворы аб здачы Шанхаю бяз бою. Адначасна ўвесь кітайскі ваенны флёт, што стаяў у шанхайскім порце, перайшоў — усьлед за сваім адміралам—на бок Кантону. Флёт гэты, праўда, ня вельмі ўжо баявы, бо стары,—але ўсё-ж налічывае 4 крэйсэры, 5 мінаносцаў ды 3 кананеркі. Але галоўная рэч — у маральным уплыве гэтага акту на ваюючыя войскі...

У той самы час галоўныя сілы арміі Чанг-Тсо-Ліна быццам ідуць на Ханькоў, разьбіўшы на гэтым шляху былага свайго саюзьніка ген. Ву Пэй-Фу, які бараніў сваю правінцыю.

Шанхай таксама заняты!

У аўторак газэты падалі вестку, што Шанхай ужо здабыты кантонскай арміяй.

Камэндант шанхайскіх „белых“ войск уцёк на тэрыторыю францускае канцэсіі.

У Польшчы.

У справе Адозвы Польскай Лігі Абароны Правоў Чалавека.

Варшаўскі Акружны Суд зацьвярдзіў канфіскату адозвы Польскай Лігі Абароны Прав. Чалав. і Грамадзяніна, у якой зьмешчаны пратэст проці далейшых надужыцьцяў уладаў у вастрогах ды ў паліцэйскіх арыштах. Апрача таго суд пацягнуў да адказнасьці ўсіх падпісаўшых адозву „абаронцаў правоў чалавека і грамадзяніна“ ў Польшчы, запраўды ж — найлепшых людзей з польскага грамадзянства... Гэтыя абаронцы вінавацяцца пракурорам у „непашане да ўлады“ і ў „распаўсюджываньні фальшывых вестак, якія могуць выклікаць трывогу ў грамадзянстве“...

У справе амэрыканскай пазыкі Польшчы.

„Дзен. Віл.“ даведаўся дакладна аб тым, што польскія дэлегаты, езьдзіўшыя ў Амэрыку за „залатым руном“, варочаюцца ні з чым. „Пазыкі, праўда, не адмовілі наадрэз, але варункі, на якіх Амэрыка гатова даць пазыку,—такія, што ня толькі абражаюць годнасьць польскай дзяржавы, але папросту б'юць у яе незалежнасьць ды самастойнасьць“... Варункі гэтыя — добра ведамыя: поўны фінанс[illegible] а ў выніку таго—і палітычны кантро[illegible] уладай, як у ўнутранай, таксама і ў вонкавай яе палітыцы. Але найбольш цікаўна, што газэта цьвердзіць, быццам сучасны польскі ўрад гатовы пайсьці на ўсе гэтыя варункі, каб атрымаць пазыку—„за ўсялякую цану“... Што дзеля таго ён і паслаў у Амэрыку кракаўскага праф. Кшыжаноўскага, гарачага прыхільніка пазыкі—на ўсіх варунках. У канцы газэта дадае, што адно толькі яшчэ можа ўратаваць ад гэтай „небясьпекі“ Польшчу: гэта — Сойм, ад якога, паводле Канстытуцыі, залежыць зацьвярдзіць пазыку, ці не. Калі навет урад начхае на Сойм, дык можа крэдытары будуць асьцярожней самі і бяз згоды Сойму ня будуць рызыкаваць грашмі...

Заграніцай.

Націск Англіі з Італіяй на Югаславію.

Яўна рыхтуючыся з дазволу Англіі — да ваеннага захвату Альбаніі, Італія крычыць на ўвесь сьвет аб тым, што Югаславія ўваружаецца дзеля нападу на Альбанію. Італьянскі пасол аддаў белградзкаму ўраду ноту— такога ж зьместу, якая выслана ўсім вялікім дзяржавам. Зараз-жа пасьля гэтага да югаслаўскага міністра замежных спраў прыяжджаў ангілйскі пасол, які заявіў, што—далучаецца да заявы італьянскага пасла. У заяве італьянскі пасол пагражае Югаславіі „фатальнымі вынікамі ад падтрыманьня альбанскіх паўстанцаў“, прыводзячы цэлы рад фактаў падгатоўкі Югаславіі да вайны.

Югаслаўскі міністар рашуча запярэчыў усім „фактам“, якія падалі паслы.

Гэты цынічны націск Англіі і Італіі на Югаславію, каб пакінула безбаронную Альбанію, як дабычу для Італіі, выклікаў страшэннае абурэньне ў Югаславіі.

Найбольш цікаўна ўва ўсей гэтай агіднай акцыі тое, што навет само альбанскае пасольства ў Лёндане пярэчыць весткам аб „мабілізацыі“ ў Югаславіі. Альбанскі народ, прэданы сваім дыктатарам Ахмэдам Італіі, сам шукае помачы і абароны ў Югаславіі. Паўстанчы рух шырыцца стыхійна сам сабой.

Паўстанчы рух у Альбаніі.

Альбанскія рэвалюцыянэры распачалі падгатоўку дзеля аказаньня адпору італьянцам, якія рыхтуюцца аканчальна заўладаць Альбаніяй.

На альбанскім узьбярэжжы высадзіліся 100 італьянскіх афіцэраў, якія маюць кіраваць аружнымі сіламі Ахмэда Зогу, які прадаў свой край Італіі.

Рэвалюцыянэры спадзяюцца на дапамогу ў барацьбе з італьянскімі захватчыкамі — на Югаславію, Францыю і ССРР.

„Праўда“ аб англійска-італьянскай палітыцы.

Абгаварываючы прызнаньне італьянскім урадам Бэсарабіі за Румыніяй, „Праўда“ піша, што гэты частковы пасьпех Чэмбэрлена зусім не стварае яшчэ таго процірадавага фронту, аб якім лятуцiць Англія. Міжнародавае становішча СССР—мацней, чым думае Чэмбэрлен. Нямеччына не пайшла на спакусы Чэмбэрлена, не жадаючы зрываць добрыя адносіны з Радамі. Плаціць за гэта Нямеччыне з англійскай кішані Чэмбэрлен не хацеў, а Францыя рашуча адмовілася з сваей кішані плаціць за англійска-нямецкае зблiжэньне коштам СССР. Гэткім чынам стварaецца магчымасьць паразуменьня і з Францыяй. А гэта — тым больш, што Югаславія, якой пагражае супольны англійска-італьянскі націск, павінна шукаць помачы і абароны толькі ў Францыі ды СССР. Умова з Турцыяй і толькі што падпісаны Трактат з Латвіяй—паралізуюць у значнай меры процірадавыя пляны Англіі, якая пэўна ж будзе і далей шукаць магчымасьцяў ды ходаў, каб шкодзіць СССР.

Румынія ставіць у Бэсарабіі памятнік Мусоліні.

У падзяку за „падараваньне“ Румыніі Бэсарабіі, румынскі ўрад пастанавіў паставіць Мусоліні памятнік у слаўным сваімі пагромамі месьце Кішынёве.

Пратэст Радаў.

Радавы ўрад заявіў у Рыме пратэст проці прызнаньня італьянскім урадам румынскага панаваньня над Бэсарабіяй.

Латвійскі ўрад пацьвярджае нэйтралітэт Латвіі.

Латвійскі міністар замежных спраў Цэленс заявіў у прамове ў Лібаве, што сучасны ўрад будзе няўхільна бараніць прынцып нэйтралітэту Латвіі—на выпадак нападу якой дзяржавы на СССР.

Перагаворы Вальдэмараса з Цэленсам.

Польская прэса ў сэнсацыйнай форме падае вестку аб вельмі важных перагаворах, якія галава літоўскага ўраду вёў з латвійскім міністрам заграністых спраў у часе пахаронаў прэзыдэнта Латвіі, Чакстэ.

Судзячы паводле тону газэт, відаць, што перагаворы гэтыя — непамысныя для польскае палітыкі.

Узнаўленьне перагавораў між СССР і Францыяй.

Француская прэса даведалася, быццам у Парыж мае прыехаць Чычэрын — дзеля ўзнаўленьня француска радавых перагавораў у справе даўгоў і заключэньня дагавору. Быццам Рады маюць зрабіць далейшыя ўступкі Францыі, каб толькі ня мець адначасна проці сябе, апрача Англіі, яшчэ і Францыю. Гэтую задачу мае распачаць ды пакінуць паслу Ракоўскаму сам Чычэрын асабіста.

Нямеччына разбурывае крэпасьці.

Нямецкі ўрад пачаў сумленна выпаўняць парыжскую ўмову ў справе разбурэньня часткі ўкрапленьняў, пабудаваных удоўж польскай граніцы — пад Кенігсбэргам і ў іншых мясцох.

Недахват у англійскім бюджэце.

Недахват у англійскім бюджэце ў гэтым годзе (бюджэтны год у Англіі канчаецца 31 сакавіка) аблічаны на 40 мільёнаў фунтаў, ці 20 мільёнаў даляраў. Далася ў знакі ангдійцам кітайская авантура!..

Злагоджаньне канфлікту між Мэксікай і Амэрыкай.

Амэрыканскі сэкрэтар замежных спраў заявіў, што няма больш небясьпекі вайны з Мэксікай. Мэксіка згадзілася ўсе спрэчныя пытаньні вырашыць шляхам перагавораў, уступіўшы перад усім у справе нафтавых крыніцаў. Газэты дапускаюць, што Мэксіка пайшла на ўступкі з прычыны вельмі рашучых нотаў з боку амэрыканскага ўраду. Зьмест гэтых нотаў трымаецца ў вялізарным сэкрэце.

На Усходзе Эўропы.

Невялічкая - Латвія раптам выклікала страшэннае парушэньне ў-ва ўсім сьвеце: латвійскі ўрад падпісаў **трактат прыязьні** з сваей магутнай суседкай — СССР. Абураныя гэтым буржуазныя дзяржавы Заходу, каб паменшыць уражаньне ад гэтага кроку, пашыралі весткі, быццам трактат падпісаны яшчэ не цалком, дый не абязывае яшчэ дагаварыўшыхся старон. Але весткі гэныя аказаліся не праўдзівымі.—Трактат падпісаны цалком. Не ўстаноўлены аканчальна толькі дробныя „дадаткі“ да яго.

Як высьняецца, апошнім таўчком, які [illegible]хнуў латвійскі ўрад на становучы крок у к[illegible]уменьня з Радамі, аказаліся добра ведамыя ўраду падрыхтаваньні ў Латвіі да **фашыстаўскага пераваоту**, падобнага да таго, які адбыўся і дзе інш — па суседзтву, а перадусім — у Літве. Ня трэба было ўраду мець 8 вочаў на азадзіне, як у павука, каб—пасьля літоўскіх падзей—зьвярнуць увагу на аналягічную акцыю, кіраваную ў Латвіі тэй-жа рукой, поўнай залатых фунтаў... Дык латвійскай дэмакратыі, на чале з сацыял дэмакратычным урадам, трэба было выбіраць: або пакланіцца ваенна-фашыстаўскаму боту, кіраванаму лёнданскім моноклем (шкло на адно вока, якое носіць пан Чэмбэрлен), які маючы сваі сусьветна-палітычныя мэты, глядзіць на Латвію, Літву, Польшчу і інш. жывыя дзяржавы, як на шашкі на шахаўніцы, ды не задумаецца папхнуць іх на сьмяротную бойню, а мо' і на гібель у вайне з Радамі; або, глядзячы на сябе свой лёс і эканамічную залежнасьць ад магутнай усходняй суседкі, дагаварыцца з ёй беспасрэдна ды забясьпечыць сабе ня толькі жыцьцё і граніцы, але і—гаспадарчы дабрабыт. Латышы выбралі тое, што лічылі для сябе больш карысным.

Але, відаць, латвійская, хоць і вельмі нячысьленая, буржуазія глыбока заразілася фашыстаўскай хваробай... „Абоз Вялікай Латвіі“ распачаў страшэнную агітацыю проці паразуменьня з Радамі. У краёвай прэсе распачалася страшэнна вострая кампанія проці трактату. Адначасна заварушыліся і падпольныя арганізацыі фашыстаў, якія не пакінулі думкі аб пераваоце. Аб гэтым ярка сьведчыць нязвычайная для... міністра заграністых спраў, аўтара і абаронцы трактату з Радамі, адозва, якая **заклікае латвійскіх работнікаў—стаяць на варце ў поўнай баявой гатоўнасьці**, каб у кожны мамэнт разьбіць рыхтаваны ў падпольлі фашыстаўскі замах. З гэтага відаць, што фашыстаўская буржуазія ў Латвіі правакуе амаль ня хатнюю вайну.. Ня трэба вялікага спрыту, каб зразумець, што гэтыя дарэмныя высілкі толькі далей папхнуць латвійскую дэмакратыю да зьбліжэньня з СССР.

Гэты пасьпех радавай дыпляматыі ў Латвіі **разьбівае англійскі плян ваеннага і эканамічнага акружэньня СССР**, ды адрэзаньня яго ад рэшты Эўропы. Трэба дадаць, што радава-латвійскі трактат прадбачыць і **адыход Латвіі ад Лігі Народаў**, што ня менш непакоіць кіраўнікоў апошняе... Справа ў тым, што ўжо Нямеччына ў Рапальскім Трактаце абязалася ня прымаць учасьця ў ваеннай і гаспадарчай супольнай акцыі сяброў Лігі проці Радаў, калі б Радавы Саюз быў прызнаны Лігай за „вінавайцу новай вайны“... На гэтай падставе Нямеччына патрэбавала, каб Ліга звольніла яе ад гэнага абавязку. Ад гэтага страшэнна пахіснулася ўся тая „процірадавая крэпасьць“, якая была пабудавана ў лоне Лігі Народаў. А вось цяпер гэткі самы „вынятак“ зроблены і Латвіяй, ня кажучы ўжо аб тым, што вельмі падобны Трактат падпісаны з Радамі і Літвой... Гэткім чынам выходзіць, што магутная жэнэўская „Пані“ зусім траціць свае „вдзенкі“ — на Усходзе Эўропы, дзе пачынаюцца ўплывы нейкай зусім іншай, але ня менш магутнай „Пані“...

Як цяпер будзе з Эстоніяй, цяжка прадбачыць. У Эстоніі ўрад—чыста буржуазны, падобны да сучаснага літоўскага. Трэба толькі дадаць, што эстонскае грамадзянства—значна больш палітычна і гаспадарча дасьпелае і дзеля таго больш незалежнае, чым літоўскае. Ня трэба забывацца і аб тым, што між Эстоніяй і Латвіяй істнуе ня толькі цеснае гаспадарчае паразуменьне, але і—**мытная ўнія**. А ведама ўсім, якую важную ролю ў дзяржаўным аб'яднаньні Нямеччыны адыграла мытная ўнія...

Што эстонскае грамадзянства перад усім цьвяроза заглядаецца на справы свайго дзяржаўнага быту і сваей заграністай палітыкі, аб гэтым зусім нядаўна казаў эстонскі пасол у Парыжу п. Пуста — у сваей лекцыі ў унівэрсытэце ім. Карнэджы. Ен даў вельмі цікаўны гістарычны агляд зьмяняўшыхся плянаў аб'яднаньня балтыцкіх дзяржаваў — ад 1919 г. да нашых дзён.—Сьпярша дыпляматыя балтыцкіх дзяржаў, створаных на землях былой Расеі, лятуцела ды працавала над стварэньнем вялікага блёку ўсіх дзяржаў, якія ляжаць навакол Балтыцкага мора: Скандынаўскіх (Швэцыі, Нарвэгіі, Даніі), Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі, Літвы і Польшчы. Пасьля неяк высьнілася, што лятуценьні аб Скандынавіі трэба пакінуць... Пасьля сталася ясным, што трэба пакінуць думку і аб Польшчы, якая якраз высоўвала сябе ўсьцяж на становішча „павадыра“ Балтыцкай Уніі... Пасьля з чатырох астаўшыхся дзяржаў рэальна можна было гутарыць толькі аб трох, бо Фінляндыя адпала... Крыху пазьней неяк аддзялілася і Літва Эстонія асталася толькі з аднэй Латвіяй, з якой і заключыла цесную мытна-гаспадарчую ўнію... З рэштай дзяржаў (з трыма) падпісаны толькі трактаты прыязьні. „Гэта — вельмі скромны рэзультат, які астаўся ад вялікіх лятуценьняў і плянаў, але гэты рэзультат затое—зусім рэальны“... „Дык можа, выходзячы з гэтага рэальнага і трывалага саюзу з Латвіяй, можна будзе дайсьці да нечага яшчэ шырэйшага, але ня менш рэальнага“...

З гэтага відаць, што цьвярозы эстонскі палітык рашуча адкідае той фантастычны ды небясьпечны мэтад міжнародавай палітыкі, які быў накінуты Эстоніі хворым рамантызмам некаторых балтыцкіх дзяржаваў у 1919 г., а выбраў рашуча мэтад рэальнага гаспадарчага інтарэсу. Калі мець на ўвазе, што якраз цьвярозая сьведамасьць сваіх рэальных гаспадарчых інтарэсаў папхнула латвійскі ўрад адкінуць прапанаваны яму небясьпечны мэтад „барацьбы з Радамі“ ў саюзе з... Лігай Народаў і выбраць саюз з СССР,—дык можна прадбачыць, як пойдзе далей справа адносінаў паміж СССР і Эстоніяй.

Шчыра дзякую ўсім грамадзянам, якія прынялі ўчасьце ў пахаваньні майго бацькі,

Уладзімера Канчэўскага.

Арсень Канчэўскі.

Вронкі (турма)

ХРОНІКА.

Да сьвяткаваньня ўгодкаў незалежнасьці Беларусі. Беларускі Нацыянальны Камітэт у Вільні пастанавіў зрабіць урачыстае паседжаньне 25 сакавіка — ў дзень 9 тых угодкаў абвяшчэньня незалежнасьці Беларусі Радай Рэспублікі ў Менску. Паседжаньне гэтае будзе **закрытае**.

Польская прэса паведамляе, што хадэкі і сельсаюзьнікі ў гэты дзень ладзяць вялікі і гучны банкет у гасьцініцы Жоржа. Гэтак будуць сьвяткаваць ня столькі гадавіну незалежнасьці, сколькі... разгром Грамады і паняволеньне грамадаўскіх паслоў. Сораму няма ў іх перад людзьмі: калі лепшыя сыны народу—за кратамі, яны—банкетуюць!

Вечар у Гімназіі. У пятніцу, у салі Віленскае Беларускае Гімназіі ладзіцца вечар. У праграме — камэдыя „Пашыліся ў дурні“, выступленьні школьнага хору і аркестру. Пачатак у 7 гадз. увечары.

Чарговая лецыя. У Цэнтр. Гуртку Т-ва Бел. Школы (вуль. сьв. Анны 2) у суботу 26-га сакавіка, у 7 гадз. увечары прачытае лекцыю д-р Ян Станкевіч аб важнейшых мамэнтах у гісторыі Белар. культуры.

Пратэст проці незаконнага цыркуляру. Як ведама, віленскі куратар загадаў, каб беларускія, жыдоўскія і літоўскія школы ўвялі ў сябе ў 1, 2 і 3 клясах выклад гісторыі Польшчы ў польскай-жа мове.

Дэлегацыя ўсіх трох зацікаўленых нацыянальнасьцяў зьвярнулася была да куратара з пратэстам проці гэтага беспадстаўнага загаду. На гэта ім было адказана, што яны могуць жаліцца міністру асьветы, а да рэзалюцыі міністра загад будзе прыпынены.

Тады паехала ў Варшаву спэцыяльная дэлегацыя ад беларускіх (сэн. Уласаў), жыдоўскіх і літоўскіх культурна-асьветных установаў з супольным мэмарыялам у гэтай справе. Міністар асьветы д р Добруцкі адмовіўся прыняць дэлегацыю цалком і прымаў прадстаўнікоў кожнае нацыянальнасьці асобна. Аднак, гэта не зьмяніла солідарнага становішча ўсіх трох дэлегацыяў. Міністар заявіў, што яму нічога ня ведама аб гэткім дамаганьні міністэрства, ды што ён сам прызнае яго неабаснаваным. Міністар абяцаў разважыць справу ў прыхільным для дэлегацыі духу.

„Хрэстаматыя Новай Беларускай Літэратуры. Выйшаў першы сшытак гэтае прост неабходнае сягоньня кніжкі, укладзенай І. Дварчанінам. У гэты сшытак (82 стр.) увайшлі выбраныя творы Ядвігіна Ш. (Антона Лявіцкага), Каруся Каганца (Казімера Кастравіцкага), Альбэрта Паўловіча і „Цёткі“ (Алёізіі з Пашкевічаў Кайрысовай). Падбор твораў датасаваны да курсу беларускае літэратуры ў сярэдніх школах. І па зьместу і па вонкаваму выгляду кніжка робіць вельмі добрае ўражаньне.

У найбліжэйшым часе выходзе другая кніжка „Хрэстаматыі“ (Янка Купала, Якуб Колас).

„Заранка“. Выйшаў з друку № 1 журнала для дзяцей пад назовам „Заранка“. Маленечкая кніжачка, 16 страніц, у вокладцы з прыгожым рысункам. Выходзе раз у месяц.

Ідэя „Заранкі“ — вельмі добрая, якая мае даць школьнікам наймалодшых клясаў цікаўны матэрыял да чытаньня. Ёсьць тут і вершыкі, і невялічкая заметка аб паэце Алесю Гаруну, і папулярны выклад аб агні—ў форме апавяданьня, і пра вясну, і казка народная, і аб майстраваньні дзіцячых цацак, і ўрэшце—загадкі і „круцігалоўкі“.

Зьмест падабраны добра. Відаць, што людзі з любасьцяй бяруцца за работу. Адно бяда—шмат абмылак у тэксьце, у чым, як кажуць, вінавата неакуратнасьць друкарні.

Але ёсьць і заганы, якія трэ ўзлажыць на адказнасьць Рэдакцыі: грахі ў мове. Такія выражэньні, як „шак“ (польскае „wszak“), як „усклінуў“ (расейскае „воскликнул“), як „дабрадзейца“ і інш.,—не павінны ўжывацца ў кніжцы для дзетак, якіх, наадварот, трэ прывучаць да чыстасьці мовы.

Спадзяемся, што да працы ў „Заранцы“ возьмецца больш ахвочых рук, дык і гэтыя заганы самі сабой счэзнуць!

Рэдагуе і выдае „Заранку“ грам. Л. Войцікова.

„Бібліатэка для моладзі“. Заслужонае ў беларускім руху Беларускае Выдавецкае Таварыства прыступіла да друку кніжак для моладзі. Першая сэрыя складаецца з гэткіх шасьцёх твораў (перакладзеных): 1) Робінзон Крузо; 2) Амічыса: Сэрца; 3) Р. Кіплінга: Кніга джунгляў; 4) Марка Твэна: Прыгоды Гука Фіна; 5) Бічэр Стоў: Хата дзядзькі Тома; 6) Нямцовай: Бабулька (з чэскае мовы). Праца над перакладамі ідзе поўным ходам, і рукапісы ў найбліжэйшыя дні будуць ужо аддадзены ў друк.

Трэба шчыра прывітаць пачынаньне Таварыства ў кірунку здаваленьня духовых патрэб беларускае моладзі, даючы ей добрую кніжку да чытаньня.

Каапэратыўнае жыцьцё. Пасьля разгрому беларускае каапэрацыі, кіраўніцтва нашым каапэратыўным жыцьцём узяў на сябе Віленскі Аддзел Саюза Каапэрат. Польскае Рэспублікі. Бачучы, у якім сумным палажэньні знаходзіцца цяпер наша вясковая каапэрацыя, Віленскі Аддзел, у які ператварыўся былы Саюз Каапэратываў нашага краю, склікае на 3-га красавіка ў 9 гадз. раніцы канфэрэнцыю ў Вільні (М. Пагулянка № 12), на якой будзе прачытаны рад дакладаў і адбудзецца абмен думак у гэтых справах: 1) Справа прыцягаваньня сяброў (даклад Ф. Домбровскага); 2) Лічэбны стан сяброў у каапэратывах віленскага вокругу і спосабы паляпшэньня яго (дакл. Л. Арэхвы), 3) Справаздача з дзеяльнасьці Аддзелу за 1926 год (дакл. А. Лозіньскага); 4) Справы зьезду (даклад Ф. Домбровскага); 5) Дзень каапэрацыі ў 1927 г. (дакл. Г. Ясеньскага); 6) Плян работы і выбары Акружное Рады (таго-ж); 7) Вольныя прапазіцыі.

У канфэрэнцыі маюць права прыняць учасьце сябры надзорчых рад і ўпраў каапэратываў, а так-жа асобы, якія чынна працуюць у прапагандова-асьветнай галіне.

Паседжаньне Радных Касы Хворых. Праўленьне Касы Хворых м. Вільні запрашае ўсіх Радных на паседжаньне, якое адбудзецца 30-га сакавіка 1927 г. у 8 гадз. увечары ў салі засяданьня Гарадзкой Рады для разгледжаньня праекту новага Уставу аб абавязкавам забясьпечаньні ў выпадку хваробы, аб забясьпечаньні работнікаў на выпадак няздольнасьці да заработку, а так жа іх сямей на выпадак сьмерці забясьпечанага.

Спраставаньне. У аднаднёўцы „Наш Водклік“ пры расцэнцы кніг таннае прадажы ўкралася абмылка напісана: „Родны край“ III—IV ч. замест 1 зл.—50 гр. Трэба—замест 3 зл.—1 зл. 50 гр.

Афіцыяльны курс грошы на 23 сакавіка. Даляр—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

23./III на чорнай біржы ў Вільні за даляр плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

З Т-ва Беларускае Школы.

Паведамленьне.

Горадзенская Акружная Управа Т-ва Беларускае Школы зьвяртаецца да ўсіх гурткоў Т-ва, якія заложаныя і істнуюць на тэрыторыі дзейнасьці Горадзенскай Акружной Управы і да ўсіх грамадзян, якія пражываюць на тэрыторыі Горадзенскага пав., і жадаюць уступіць у сябры Т-ва, залажыць гурток, адчыніць народны дом, бібліатэку-чытальню каб надсылалі заявы і зьвярталіся па ўсім гэтым пытаньням у Горадзенскую Акружную Управу (Горадня, Парахавая вул. № 4 пам. 42, а не ў Галоўную Управу, як некаторыя рабілі дагэтуль, бо ўсе заявы і паперы па гэтым пытаньням будзе Галоўная Управа перасылаць нам для выпаўненьня. Дзеля гэтага просім не наражаць Галоўную Управу на лішнія карэспандэнцыйныя расходы.

Горадзен. Акр. Управа
Т-ва Беларускае Школы.

П а д з я к а.

Глыбоцкая Акружная Управа Т-ва Беларускае Школы прыносе шчырую падзяку за прысланыя ахвяры на будову беларускай гімназіі ў Глыбокім: Мікалаю Глінскаму—за 10 руб. зол., Пятру Глінскаму, Уладзіміру Мятле, Мікалаю Кабаку і Васілю Глінскаму—за 28 зл., А. Дуравічанцы — за 4 зл. 17 гр., грамадзянам вёскі Блізна, Косаўскага пав.—за 25 зл. 84 гр., в. Долгбы, гм. Сьв.-Воля—за 14 зл. 39 гр., в. Сасноўка, Пружанскага пав.—за 5 зл., в. Асташына, Навагрaдзкага пав. — 20 зл. 25 гр., в. Баяры таго-ж пав.—4 зл. 35 гр., в. Була, Косаўск. пав. — 6 зл., в. Куляшы, таго ж пав. — 5 зл. 30 гр., вёска Шчыцкае, таго-ж пав.—4 зл. 50 гр., гурткам: Езотаўскаму, Беласт. пав.—1 зл. 80 гр., Катадліцкаму — 10 зл. 40 гр., Пляхоўшчынскаму, Пружанск. пав. — 5 зл., Бусяжскаму, Косаўскага пав. — 7 зл. 1 гр., Баравіцкаму, Навагрaдзк. пав.—3 зл. 75 гр., грамадзянам Празароцкае гм. — за 98 зл. 50 гр., і грам. сабраўшым грошы па падпісным лістам: Янку Маслоўскаму пад. ліст № 30/II — 18 зл. 90 гр., Янку Мятле п. л. № 24/I 2 зл. 25 зл., Сьцяпану Мятле п. л. № 21/6—22 зл., Юрку Краську, п. л. № 20—4 зл. 50 гр., Янку Ганебнаму п. л. № 24—2 зл. 50 гр., і Станіславу Ярковіцу п. л. № 34—14 зл. 60 гр.

Управа.

С Ь П І С

асоб, ахвяраваўшых на адбудову Гімназіі ў Глыбокім: Шудзель Аляксандар—10 гр., Фомін Зьмітрук—10 гр., Катовіч Тамаш 10 гр., Катовіч Цыпрыян—10 гр., Васюцёнак Захарка—10 гр., Маляўка Юльян — 10 гр., Пепка Янка—10 гр., Маляўка Янка—10 гр., Катовіч Аляксандар — 10 гр., Васюцёнак Міхалка—10 гр., Чэркес Янка—10 гр., Бортнік Гарасім — 10 гр.

Збор у Амэрыцы.

У Амэрыцы ахвяры на Глыбоцкую Гімназію зьбірае: Беларускі Нацыянальны Саюз у Чыкаго (скарбнік І. Курдзёнак—1748 Вэст 45 вул. ў Чыкаго) і грам. Андрэй Татарын.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

КАРЭСПАНДЭНЦЫ

Інспэктары працуюць.

ПРАТАКОЛ.

Мы, ніжэй падпісаныя сяляне вёскі Каловічы, Вялейскае воласьці, у студзені месяцы былі сазваны на сход у школу прадстаўніком інспэктара, як бацькі вучняў. Прадстаўнік гэты зарэкамандаваўся школьным апякуном з Вільні і сказаў што ён, як такі, хоча палепшыць школьныя недастаткі. У першую чаргу пачаў ён у нас пытацца, як вучыцялі вучаць дзяцей, якія недастатак у школе і чаго мы хочам і як мы хочам вучыць дзяцей. Вось мы яму ўсе недастаткі і выказалі: што хочам вучыць на беларускай мове; каб былі даны дарма ад ураду кніжкі, чарніла, сшыткі і ўсё, што патрэбна для школы і жаліліся яму на ўсе недастаткі школ і на цяперашняе навучаньне дзяцей вучыцялямі. Выслухаўшы ўсё сказанае намі, ён напісаў пратакол і так добра яго склаў. Дабавіў навет яшчэ, што мы жадаем навучаньня панямецку, пафранцуску, не забыўся і пра польскі, які запісаў у першую чаргу. Пратакол гэты ён нам падсунуў падпісаць. І праўда, як ён так добра напісаў гэты пратакол — дык мы і згадзіліся падпісаць і ўжо ў трох, што стаялі бліжэй да стала, расьпісаліся. Але да пратаколу ён падсунуў яшчэ і другія паперы, напісаныя папольску з тым, каб мы іх падпісалі. Дык зразу, не разгледзіўшы, першыя тры і тут расьпісаліся. Але за імі адзін пасьпеў прачытаць, што гэта польскія дэклярацыі, дык астальным сказаў не расьпісывацца, а гэтага „апякуна над дзецьмі“ папрасіў прачытаць тую дадатковую паперку, кажучы, што мы ня ведаем, над чым расьпісаліся“. „Апякун над дзяцьмі“ прачытаў. І што-ж, аказалася, што гэта дэклярацыя на польскую ўрадовую школу. Тады мы папрасілі закасаваць нашы подпісы і сказалі яму, што мы ўжо падалі дэклярацыі на ўрадовую беларускую школу і што нам гэтых дэклярацыяў зусім досіць—другіх жа дэклярацыяў падпісываць нізашто ня будзем. „Апякун“ зазлаваўся на нас і са злосьці зачыркнуў нашы падпісы на дэклярацыях і пратакол таксама пакасаваў, кажучы, што Вам з гэтага нічога ня будзе, што Вы прасілі, за тое, што Вы не падпісаліся. На гэта мы адказалі, што нам і так вядома Ваша навучаньне і спакойна пашлі са школы. Дык вот як нас гэты „апякун“ хацеў ашукаць, але мы ня дурні, дык нічога і ня вышла.

Сапраўднасьць усяго тут сказанага сцьвярджаем уласнаручнымі подпісамі

1) Мікіта Субач, 2) Пётра Пагуда, 3) (неразборчывы), 4) Сьцяпан Дупешка, 5) Аляксандар Дубовік, 6) Марцін Клесняк, 7) Аляксандар Смолік, 8) Варфаламей Новаш, 9) Васіль Новаш, 10) Васіль Альфэр, 11) Антон Гулецкі, 12) Янка Смолік, 13) Павал Новаш, 14) В. А. Пагуда, 15) Рыгор Клешняк, 16) А. Кумпяк, 17) Раман Рагач, 18) Янка Смолік, 19) (неразборчывы), 20) (няпісьменны).

Спэктакль у м. Казянах.

(Браслаўскі павет).

Управа Гуртка Т-ва Беларускае Школы ў м. Казяны 19 і 20 лютага зладзіла спэктакль з наступнай праграмай: 1) „Лекары і лекі“—камэдыя ў аднэй дзеі, 2) „У кавалёвай хаце“, 3) дэклямацыі беларускіх вершаў, 4) Хор. Народу было вельмі многа. Кожны нумар праграмы спатыкаўся з вялікім зацікаўленьнем. На сцэну сыпаліся кветкі, а культурна-асьветным дзеячом быў паднесены асобны букет. Паліцыі вельмі хацелася прыдрацца да нашага спэктаклю. Яна апрацавала апінію і паслала ў Староства, у якой яна старалася давесьці антыпанствовасьць і таму навет паперакручвала словы у прадэклямаваных вершах. Найбольш прыдзірак было да вершу „Родны Край“.

Такім чынам трэба адзначыць, што першыя крокі культурна асьветнае працы нашага Гуртка вельмі ўдатныя. Бяда толькі ў тым, што мясцовая адміністрацыя страшна прыдзіраецца і перашкаджае ў працы. Яна шукае ўсякіх спосабаў, каб зачыніць наш Гурток Т-ва Беларускае Школы.

Добрая запамога.

(Маладэчанскі пав.).

Сяляне вёскі Быхаўшчына, Маладэчанскае воласьці даведаліся, што „будуць“ даваць грошы на насевак. Дык зараз-жа пашлі запісывацца на гэту пажычку ў м. Маладэчна. Хто запісаўся на 100 зл., хто на 150, а хто і на больш хацеў, але як пашлі браць гэту пажычку, дык аказалася, што давалі ўсяго па 50—60 зл., ды і з гэтага вылічылі вялікі процант, так што фактычна сяляне атрымоўвалі па злотых 44, а то і па 35. Такой пажычкай сяляне былі надта зьдзіўлены і сталі пытацца, што гэта мае значыць. На пытаньні іхныя было адказана, што кожны, хто бярэ пажычку будзе сябрам мясцовага банку. Таму і вылічаюць з іх на пай па 10 зл. (увесь пай 20 зл.), на ўпісныя па 2 зл., працэнту 2 зл. і 75 гр.; за вэксаль 30 гр., і па 70 гр. на канцэлярыйныя расходы. Так што вылічылі ня 5 проц., як казалі, а 25 проц. Пажычку-ж сялянам давалі, каб пявялічыць лік сяброў банку. Вось табе і дапамога на насеньне! Бухаўскі.

Выбары солтыса.

(Лідзкі пав.).

У вёсцы Дакудава, Дакудаўскае воласьці, былі зроблены перавыбары солтыса і замест старога солтыса, бышага ў 1926 г.— Васілеўскага Язэпа — выбралі грамадзяніна Даўлюда Паўлюка. Панскія падлізьнікі тэйжа вёскі Сарока Болесь, і Бондар Пётра пашлі ў воласьць і зрабілі заяву, што быццам Даўлюд Паўлюк надта кепскі чалавек, бо ён зьяўляецца грамадзістам. Праз нейкісь час прышоў ад Лідзкага Старасты загад зрабіць перавыбары і замест Даўлюда выбраць другога. Сяляне сабраліся на сход, пагаварылі між сабой і выбралі зноў Даўлюда Паўлюка, кажучы сабе, што ў нас ёсьць выбарнае права, апіраючыся на якое мы і можам выбраць, каго хочам, а не таго, каго хоча Староста. Ясна, што такія перавыбары Сароку Болесю і Бондару Пётру не спадабаліся, бо яны чуюцца ня зусім чыстымі ў адносінах да сялян вёскі Дакудава. А справа вось у чым: Сарока і Бондар дзержаць паром на рацэ Нёмне ў вясковых берагох ужо 4 гады. У часе дагоды з вёскай аб цане за перавоз паромам дагаварыліся так, што сяляне будуць плаціць за перавоз па 1 пуду жыта. Але „паромныя“ паны бяруць, нікаго ня пытаючыся, па пуду і 30 фун., з чым ніяк ня можа пагадзіцца Даўлюд Паўлюк і кожны год змагаецца з гэтым самапраўствам як за сябе самога, стоячы на тым, каб сяляне і з іншых вёсак плацілі ня больш як па 1 пуду. Вось чаму Сарока і Бондар ня хочаць каб Даулюд быў выбраны за солтыса. Пралеска.

Нам пішуць з вёскі што:

× Поп Масалянскай парахвіі В. Занкевіч, калі прыехала да яго маладая пара з в. Валотыні, не хацеў даць шлюбу за тое, што ня ведалі пацераў. Але калі малады „зьмікіціў“, у чым тут справа і падсунуў папу 25 залатовак — шлюб сышоў зусім гладка, аб пацерах поп ужо больш і не заікнуўся.

× У Берштанскім лясьніцтве ўсе лясьнікі варшавякі, кажуць, дык надта шчыра яны пільнуюць лес. Так, калі стары селянін з вёскі Якубовічы, Варабей Казюк высек сабе ў лесе бярозавае біла да ваза — лясьнічы Анкер злавіў яго, прыставіў рэвальвар да грудзёй і так зьбіў беднага старыка, што той чуць да хаты вярнуўся і пралежаў цэлы тыдзень у ложку. Ды гэта ўжо не пяршыня; лясьнічы Анкер, калі спаткае каго і з дубцамі ў лесе — паб'е так, што той чуць да хаты прыдзе.

× Жыхар вёскі Дзянісава, Мікалаеўскае гміны, Дзісенскага павету, Бяляй Кастусь былы солтыс памянёнай вёскі ў 1924 г. сабраў ад сялян грошы за зямлю і спажыў іх сам, цяпер-жа сэквэстратар, прыехаўшы ў вёску 6.II 27 г., зьдзёр з сялян другі раз у суме 201 зл. апрача працантаў і экзэкуцыі. А Бяляя ня цягнуць да адказнасьці за сялянскія мазольныя грошы, бо ён мае адукацыю польскага вучыцеля і пэўна-ж гэтыя грошы правёў не адзін, а з гміннымі ўрадоўцамі. Сам ён цяпер выехаў жыць з вёскі у м. Дзісну, бо стыдна, відаць, сялянам глядзець у вочы.

× Вучыцялька вёскі Дзянісава Мікалаеўскае гміны, Дзісенскага пав., Бельска Ганна прымушае дзяцей у школе рабіць цацкі і аддаваць ёй. Калі-ж дзеці адмовяцца ад цацак, кажучы што „мы ў школу прышлі ня цацкі рабіць, а вучыцца чытаць і пісаць“ — дык, яна тады іх абзывае дурным гуртком, кажучы: „wy myślicie że w swojej wioscy założyli hurtek, to odbierzecie u panów ich krów i koni? Nie z tego nic nie będzie, nic wy nie odbierzecie, bo to jest własność zapracowana i wy jak zapracujecie, to i będziecie mieli, a z cudzej pracy grzech korzystać“. Вучыць дзяцей пяяць польскія песьні „Jeszcze Polska nie zginęła póki my żyjemy“, замест малітвы. Вучням жа загадала парабіць з дрэва стрэльбы і з гэтымі стрэльбамі ганяецца за некалькі вёрст па полі, ня гледзячы, што ў іх няма, чаго надзець, або ў лес паказаваць нейкіх краснaлюдкаў. Але такіх яшчэ ні разу не паказала, кажучы, што „zapomniałam wziąć prosowej kaszy źwierciadło i papierosów“.

Дык вось якая навука.

Заява

ў справе ўвядзеньня ў беларускім друку лацінікі.

Мы, ніжэйпадпісаныя грамадзяне м. Міра, Стаўпецкага павету, даведаўшыся аб праектаваньні камісіі да спраў беларускіх школаў пры Віленскім і Навагрудзкім куратoрыумах увясьці ў нашае беларускае пісьменства лацінікі, аднагалосна пратэстуем супроць такога безгляднага ўмешываньня ў справы нашага пісьма. Мы праваслаўныя беларусы з увагі на панаваньне з доўгіх часоў у нашых беларускіх друках гражданкі, да якой прызвычаіліся і нашы дзеці, знайшлі патрэбным бараніцца ад няслушных вымаганьняў ужываньня ў нашым друку незнаёмае нам лацінікі.

Зазначаем, што такі шлях правядзеньня беларускае культуры сярод несьвядомых толькі адсуне нас ад заваёваных многагадовай працай культурных здабычаў агульных веданьняў пісьма.

(Ідуць 35 подпісаў).

Грамадзкая ахвярнасьць.

Гурток Т-ва Беларускае Школы ў вёсцы Падстарыны, Борка Гічыцкае гміны, Косаўскага павету складае шчырую падзяку ўсім грамадзянам вёскі Падстарына за ахвяры, зложаныя на бібліатэку-чытальню пры Гуртку Т-ва Беларускае Школы ў в. Падстарына, у суме 48 зл. і 20 гр.

З Радавае Беларусі.

Дасягненьне беларускага тэатру.

Беларускі тэатр мае ўжо свае слаўныя страніцы ў беларускім адраджэнскім руху. Але ад пачатку гэтага руху будаваньне беларускага тэатру адбывалася выключна рукамі самога беларускага грамадзянства—пры дужа варожых адносінах чужое дзяржавы, якая панавала над нашым краем. Толькі зусім нядаўна—пяць гадоў назад—справа стварэньня беларускага тэатру перайшла ў рукі дзяржаўнае ўлады Радавае Беларусі. 16 верасьня мінулага году мінула роўна пяць гадоў жыцьця першага Беларускага Дзяржаўнага Тэатру ў Менску (другі такі тэатр нядаўна адчынены ў Віцебску), але водгукі гэтага дайшлі да нас толькі цяпер. Дык, хоць спозьнена, пастараемся даць прыблізны падрахунак зробленае Б. Дз. Тэатрам работы—паводле матэрыялаў, апублікаваных у Менскай прэсе.

У канцы 1918 г., як Менск стаўся савецкім, быў заснаваны Белар. Савецкі Тэатр, які праіснаваў да сярэдзіны ліпеня 1919 г., калі настала польская ўлада. Восеньню 1920 г. пасьля новае зьмены ўлады быў абвешчаны т. зв. Дзяржаўны тэатр, у склад якога ўваходзілі тры дзяржаўныя трупы: расейская, беларуская і жыдоўская. 1 жніўня 1921 г. быў заснаваны сучасны Белар. Дзяр. Тэатр, які, маючы новага мастацкага кіраўніка (А. А. Міровіча), распачаў свой першы сэзон 16 верасьня.

Так пераемна складалася папярэдняя глеба, на якой вырас Беларускі Першы Дзяржаўны Тэатр, маючы сваім папярэднікам Беларускі Савецкі Тэатр.

Як той, так і другі, па складу сваіх артыстычных сіл, ня былі тэатрамі прафэсыянальнымі: некалькі чалавек артыстаў з спэцыяльна-тэатральнаю адукацыяй і некаторыю прафэсыйна-сцэнічнаю практыкай, а іншыя—маладыя аматарскія сілы, ахвочыя толькі стварыць свой нацыянальны тэатр. Рэпэртуар—невялікі, малады, характэрны для народнага тэатру.

Новы рэжысэр БДТэатру распачаў працу над узьняцьцем на належную вышыню мастацкага боку спэктакляў, павёў навет чыста студыйную працу над новымі п'есамі рэпэртуару гэтага першага сэзону. Пастаноўка „На Купальле“ Міх. Чарота паклала ў першым-жа сэзоне працы БДТэатру новы пэрыяд.

Другі зімовы сэзон (1922 23 году) распачаўся перакладною п'есаю Паліванава „Жрэц Тарквіні“. Ня гледзячы на нявысокую мастацкую вартасьць гэтае агітацыйнае п'есы (вельмі недынамічны другі акт яе), — увод пляцовак і ўтрымаваны рух масаў з'явіліся навіною ў працы Белар. тэатру і далі пасьпех апошняму ў пашыранае ўжо аўдыторыі. Правалілася пастаноўка „Ваўкоў“ Рам. Ральмана, затое п'еса самога рэжысэра А. Міровіча „Машэка“ заняла надоўга значнае месца ў новым беларускім рэпэртуары.

Трэці сэзон 1923-4 году распачаўся п'есаю А. Міровіча „Кастусь Каліноўскі“, якая па свайму рэвалюцыйнаму зьместу і добраю мастацкаю ігрою артыстаў заваявала сабе другое месца пасьля „На Купальле“ ў рэпэртуары БДТэатру. Чарговы правал адбыўся з п'есаю аднаго маладога белар. артысты, але канец сэзону прынёс выдатны пасьпех пастаноўцы „Мешчаніна ў шляхецтве“ Мольера. Белар. тэатр упяршыню ўжыў тут шырокае карыстаньне сходамі, як пляцоўкамі, і памастацку ўмеркаванай акрабатыкай, чым выклікаў гострае абурэньне абаронцаў „клясычнасьці“ п'есы і гарачае захапленьне гэтым „новым словам“ БДТ яго адданых глядзельнікаў.

Чацьверты сэзон (1924-5 г.) прыносіць спозьненую пастаноўку „Панскага гайдука“ Наз. Быпаеўскага, на якой увага глядзельніка не асабліва затрымалася, і дзьве п'есы, пастаноўка якіх была сьведчаньнем новых дасягненьняў Белар. тэатру.—„Чырвоная маска“ (іначай „Падпальнікі“) А. Луначарскага дала магчымасьць шырока выкарыстаць пляцоўкі і рытміку руху актораў на сцэне, а „Каваль-ваявода“ А. Міровіча даў узор архітэктурнае будовы сцэны і высшыя прыклады рытмованага руху пры багатай музычнай аздобе п'есы, якія ў 2-ім акце даюць прыклад высокай дасканаласьці масавага руху.

За 4 гады сваёй папярэдняй працы тэатр заваяваў прызнаньне свае сьпеласьці і мастацкасьці сваіх пастановак, аўдыторыя сталася шырокаю, аднак, мастацкі яе густ і вымаганьні ад рэпэртуару выраслі, а апошні пасгупова заігрываўся і насьпявала патрэба яго значнага абнаўленьня.

Такая задача выпала на пяты сэзон 1925-26 году. Запрошаны тады тэатрам яшчэ адзін рэжысэр—М. А. Папоў распачаў гэты сэзон БДТэатру сваею пастаноўкаю п'есы Кальдэрона „Вясковы судзьдзя“ („Алькад з Салямэі“), пазьней ён даў „Жоржа Дандэна“ Мольера. Аўдыторыя не задаволілася першаю з названых пастановак, холадна прыняла і другую, хаця частка публікі аценіла мастацкасьць артыстычнага выкону ў першай п'есе і пышнасьць надворнае аздобы спэктаклю Мольера. „Кар'ера „таварыша Брызгаліна“ А. Міровіча, якая выявіла і здольнасьць тэатру зьдзейсьніць пастаноўку п'есы ў цэлых 18 абразох, — пасьпех мела, аднак, справы сэзону ня выраўняла, і задача абнаўленьня рэпэртуару БДТ цяжкаю спадчынаю перайшла да шостага, сучаснага ўжо сэзону 1926-27 г.

Рэпэртуар сёлета і абнаўляецца сцэве БДТэатру. Глядзельнік утвараецца новы яшчэ і праз юнацкі рэпэртуар тэатру. Палепшаны аркестр, ідуць сымфанічныя канцэрты, рыхтуюцца музычныя драмы. Пасілены балет БДТ і гатуюцца чыста балетныя спэктаклі тэатру.

Так пракладаюцца новыя сьцежкі для пашыранае працы Беларускага Першага Дзяржаўнага Тэатру. За 5 гадоў папярэдняй працы ён узгадаваў сваю аўдыторыю, мастацкія яго сілы ўмацаваліся, глядзельнік таксама вырас і вымаганьні яго падвысіліся.

Мастацкая хроніка.

Канцэртмайстар Бел. 1-га Дз. Тэатру І. Фідлон напісаў квартэт на беларускія матывы.

Выкананы сярод абмежаванага музычнага кругу, квартэт быў сустрэты вельмі добра.

Складзена юбілейная камісія, якая кіруе справаю азначэньня стагодзьдзя з дня сьмерці вялікага музыкі Бэтховэна. Камісія вызначыла два публічныя канцэрты і адзін зачынены канцэрт Музтэхнікуму.

Адзін з публічных канцэртаў будзе прысьвечаны камернай музыцы Бэтховэна, другі—вялікім сымфоніям кампазітара. Ёсьць думка выканаць на другім канцэрце выдатны твор музыкі, яго 9-ю санату.

Канцэртамі будзе кіраваць М. Купэр.

Усячына.

Экспэдыцыя на поўнач.

У Ленінградзе ідзе падрыхтоўка да першай навуковай экспэдыцыі на поўнач на дырыжаблі. Палёт распачнецца з Ленінграду на Мурман, далей праз наўночнае канцавосьсе на Аляску з ухілам да Таймырскай паўвыспы і Паўночнай Зямлі. Галоўная задача экспэдыцыі—досьледы Таймырскай паўвыспы, Паўночнай Зямлі і іншых паўночных частак, прылягаючых да СССР. Экспэдыцыя будзе мець міжнародны характар, прычым выдаткі па палёту будуць разложаны паміж усімі дзяржавамі, якія ўваходзяць у склад таварыства па вывучэньню паўночных краін. Экэнэр, дырэктар нямецкага т-ва „Цэпэлін“, прадстаўляе свой дырыжабль дзеля палёту на адзін месяц. У далейшыя маецца на мэце пабудаваць уласны дырыжабль. У Ленінградзе і Мурманску намячаецца пастройка мачт для дырыжабляў.

Лётаючая лодка з парусамі.

Нямецкі вынаходца пабудаваў лётаючую лодку, якая мае мачты і парусы. У часе палёту лодкі мачты складаюцца. Калі-ж лодка спускаецца на ваду, мачты падымаюцца, і лодка можа далей плысьці пад парусамі. Хуткасьць лодкі ў паветры - каля 250 кілёмэтраў у гадзіну. Па вадзе яна праплывае каля 10 кілёмэтраў у гадзіну. Увосень мае адбыцца пералёт на лодцы з Гамбургу ў Нью-Ёрк праз Атлянтычны акіян.

Выдавец: С. Татарын

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.